# ДЫНАСТЫЧНЫЯ ШЛЮБЫ ГЕДЫМІНАВІЧАЎ ЯК СРОДАК ДАЛУЧЭННЯ НОВЫХ ТЭРЫТОРЫЙ

**В. М. Курдзюк**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, г. Мінск;*
*veronika.kurdyuk@gmail.com;*
*навук. кір. – У. А. Падалінскі, канд. гіст. навук, дац.*

Праведзенае даследаванне дало магчымасць вызначыць сутнасць шлюбнай стратэгіі вялікіх князёў літоўскіх як сродку рэалізацыі знешняй палітыкі Вялікага Княства Літоўскага ў XIV ст. Тэма шлюбных стратэгій вялікіх князёў літоўскіх на сучасным этапе развіцця гістарыяграфіі даследавана недастаткова. Гісторыкі часцей надаюць увагу магнацкім або шляхецкім сем’ям, князям з роду Рурыкавічаў, а вось вялікія князі літоўскія засталіся па-за ўвагай. Таму можна ўпэўнена казаць пра тое, што пастаўленая праблема ў гістарычнай навуцы распрацавана вельмі фрагментарна і недастаткова. Шлюбныя сувязі былі сродкам замацавання саюзаў і перамір’яў з іншымі дзяржавамі, пашырэння палітычнага ўплыву на суседнія тэрыторыі або нават уключэння іх у склад Вялікага Княства Літоўскага. На ўсходзе Гедымінавічы з дапамогай шлюбаў імкнуліся распаўсюдзіць свой уплыў на землі Русі. Акрамя таго, дынастычныя сувязі дазволілі Вялікаму Княству Літоўскаму ў XIV ст. далучыць новыя тэрыторыі (Валынь, Віцебскае, Смаленскае і Вярхоўскія княствы).

***Ключавыя словы***: шлюбныя стратэгіі; дынастычныя сувязі; знешняя палітыка; Вялікае Княства Літоўскае; Гедымін; Альгерд; Кейстут; вялікія князі літоўскія.

Вялікія князі літоўскія праводзілі даволі разнастайную знешнюю палітыку: на захадзе практыкавалася заключэнне саюзаў, на ўсходзе вялася барацьба з Маскоўскім княствам, якое паступова ўзмацнялася. Аднак усходняя палітыка мела і іншы характар. Вялікае Княства Літоўскае, як еўрапейская дзяржава, якая ўзнікла толькі ў сярэдзіне XIII ст. і на працягу XIV ст. набірала сваю моц, праводзіла палітыку па ўключэнні ў свой склад новых зямель. Барацьба з Маскоўскім княствам патрабавала ад ВКЛ не толькі пошуку новых саюзнікаў, але і ўмацавання свайго становішча ў рэгіёне Ўсходняй Еўропы. Дзеля гэтага ВКЛ актыўна імкнулася распаўсюджваць свой палітычны ўплыў і далучаць новыя тэрыторыі. Такім шляхам вялікія князі літоўскія дзейнічалі ў першую чаргу ў адносінах да «рускіх» княстваў. ВКЛ распаўсюджвала свой уплыў на гэтыя землі як праз выкарыстанне ваеннай сілы, так і выключна палітычнымі метадамі, у прыватнасці праз заключэнне дынастычных сувязяў. Дзякуючы заключэнню шлюбаў, Вялікае Княства Літоўскае ўключыла ў свой склад Віцебскае, Смаленскае і Вярхоўскія (Навасільскае і Карачаўскае) княствы.

Першая спроба далучэння новых зямель да Вялікага Княства Літоўскага праз дынастычны шлюб была зроблена ў 1318 г. Віцебскі князь Яраслаў Васільевіч знаходзіўся ў складаным становішчы: у яго не

было сыноў, а значыць не было нашчадкаў, каму можна было б перадаць уладу ў Віцебскім княстве. Тады ён вырашыў выдаць сваю дачку Марыю замуж за сына вялікага князя літоўскага Гедыміна Альгерда. Расійскі гісторык М. Любаўскі лічыў, што Марыя была адзінай дачкой віцебскага князя Яраслава Васільевіча [1, с. 24]. Шлюб, які быў заключаны ў 1318 г., быў даволі выгодным для вялікага князя літоўскага. У 1320 г. Яраслаў Васільевіч памёр, а княства перайшло ва ўладанне мужа Марыі – Альгерда [2, с. 42]. Менавіта гэты год і лічыцца часам далучэння Віцебскай зямлі да ВКЛ.

Аднак тут было некалькі асаблівасцяў, якія даволі добра адзначыў беларускі даследчык А. Краўцэвіч. Становішча Віцебскага княства было падобна да сітуацыі на Полаччыне. Нават пасля далучэння гэтых тэрыторый да ВКЛ, Віцебскае княства захоўвала пэўную аўтаномію. Гедымін быў звязаны ў сваёй палітыцы на новадалучаных землях: «Старыны не рушыці, а навіны не ўводзіці» [3, с. 56]. Аўтаномія княства была аформлена пісьмова ў так званых абласных прывілеях. Тут захоўвалася веча, манаполія віцеблян на пасады мясцовага кіравання, старадаўніясацыяльна-палітычныя правы і інш. Князь павінен быў прыслухоўвацца да жыхароў Віцебска пры ўзвядзенні прадстаўнікоў на такія пасады як ваявода (намеснік). Віцебскае княства выплачвала ВКЛ падаткі і выконвала абавязкі ў адносінах да вайсковай павіннасці, але ўнутранае жыццё не было абмежавана [3, с. 56–57]. Вярхоўная ўлада не ўмешвалася ва ўнутраныя справы Віцебскага княства. Пацвярджэннем захавання тут аўтаноміі з’яўляецца, напрыклад, ліцвінска-інфлянцкая дамова, заключаная 1 лістапала 1338 г. З боку ВКЛ яе падпісалі вялікі князь літоўскі, а таксама князі Полацка і Віцебска [3, с. 55].

Такім чынам, шлюб Альгерда прынёс станоўчы вынік: тэрыторыя Вялікага Княства Літоўскага павялічылася, былі далучаны новыя гарады, якія знаходзіліся на Заходняй Дзвіне, з-за чаго мелі важнае гандлёвае значэнне. Віцебскае княства межавала з ВКЛ, якое ў гэты час умацоўвала сваё становішча. Сам па сабе Віцебск доўгі час не змог бы існаваць, бо ў хуткім часе больш моцныя суседзі маглі далучыць яго землі не палітычным, а ваенным шляхам. Адпаведна, было неабходна далучыцца да нейкага больш моцнага дзяржаўнага ўтварэння. У якасці апошняга і выступіла Вялікае Княства Літоўскае.

Смаленскае княства ў XIV ст. знаходзілася ў цяжкім становішчы. З усходу і захаду набіралі моц больш вялікія княствы – Маскоўскае і Літоўскае. Кожнае з іх імкнулася паставіць іншыя «рускія» княствы пад свой уплыў. Барацьба ў асноўным вялася за Цвер, Ноўгарад і Пскоў, а таксама за Смаленскае княства. Да княжання Гедыміна адносіны Смаленска і ВКЛ збольшага былі варожымі. Літоўскія дружыны неаднаразо-

ва ажыццяўлялі набегі на свайго заходняга суседа. Асабліва моцнымі былі паходы Міндоўга ў сярэдзіне XIII ст. Аднак, з уступленнем на прастол у ВКЛ Гедыміна, адносіны са Смаленскім княствам змянілі свой характар. Маскоўскі князь часта ўмешваўся ва ўнутраныя справы Смаленскага княства. Становішча ўнутры самога княства было няўстойлівым, чым і вырашыла скарыстацца Масква. Значныя спрэчкі былі паміж цэнтральнай уладай і ўдзельнымі князямі, а менавіта бранскімі ўладарамі, якія жадалі дабіцца незалежнасці і адасобіцца ад Смаленска. У 1313 г. у Смаленску стаў княжыць Іван Аляксандравіч, апанентам якога быў Дзмітрый Бранскі [4, с. 311]. На баку Дзмітрыя выступіла Масква, князь якой шукаў падтрымкі таксама і ў Ардзе. У гэтай сітуацыі Івану Аляксандравічу неабходна было шукаць саюзніка. Менавіта ў першай палове XIV ст. пачынаецца супрацьстаянне Масквы і Вільні, таму смаленскі князь вырашыў заключыць саюз з вялікім князем літоўскім (дакумент, які б пацвярджаў гэтае пагадненне і змяшчаў яго ўмовы, не захаваўся). Ардынцам не падабалася наладжванне саюзных адносін Івана Аляксандравіча з Гедымінам, да таго ж смаленскі князь спыніў выплату ардынскага выхада. І ўжо ў 1340 г. Арда пры падтрымцы маскоўскіх і разанскіх войск ажыццявіла паход на Смаленск [5, с. 55–56]. Такім чынам, пачатак саюзных адносін быў пакладзены смаленскім князем Іванам Аляксандравічам, які першым пайшоў на збліжэнне з вялікім князем літоўскім Гедымінам.

Асабліва моцны ўплыў ВКЛ стала аказваць на Смаленск у час княжання Альгерда. Першай саюзнай акцыяй можна лічыць няўдалы паход Альгерда на Мажайск у 1345 г., што ажыццяўлялася ў інтарэсах Смаленскага княства. Аднак з 1355 г. саюзныя адносіны былі парушаны паходам Альгерда на Ржэў [4, с. 318]. Паўторнае распаўсюджванне ўплыву пачалося з пачаткам княжання ў Смаленску ў 1359г. Святаслава Іванавіча, які трапіў у залежнасць ад Альгерда. Разам з вялікім князем літоўскім ён тройчы хадзіў паходамі на Маскву ў 1368, 1370, 1372 гг. [6, с. 113]. Апошні раз маскоўскі князь нават заключыў асобную дамову са Смаленскім княствам. Аднак хутка Святаслаў Іванавіч пачаў схіляцца да Масквы і ўдзельнічаць у яе знешнепалітычных акцыях. Пачалося супрацьстаянне Смаленска і ВКЛ. У 1386 г. смаленскі князь ажыццявіў паход на Мсціслаў, які належаў Вялікаму Княству Літоўскаму [5, с. 59]. Аднак пад час пахода ў бітве на рацэ Віхра Святаслаў Іванавіч памёр. Пасля чаго на смаленскі прастолбыў пасаджаны Юрый Святаслававіч, які меў кроўныя сувязі з родам Гедымінавічаў, ён быў жанаты на Алене – унучцы Альгерда, дачцэ Ефрасінні і Алега Іванавіча Разанскага. Цяпер смаленскія князі прысягалі на вернасць польскаму каралю Ягайле, а пазней вялікаму князю літоўскаму Вітаўту. Некалькі разоў пад

уплывам ВКЛ тут мяняліся князі. У выніку, у 1395 г. Смаленскае княства фактычна было далучана да Вялікага Княства Літоўскага. Пазней смаляне яшчэ будуць спрабаваць вызваліцца з-пад улады ВКЛ, але безвынікова [7, с. 447–448]. Нават маскоўскі князь Васіль І Дзмітрыевіч не мог нічога зрабіць у гэтай сітуацыі, паколькі з'яўляўся зяцем Вітаўта і быў вымушаны згадзіцца на далучэнне Смаленска да ВКЛ [1, с. 34].

У гістарыяграфіі аб дынастычных сувязях паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Смаленскім княствам вядзецца шмат спрэчак. Магчыма, паміж Гедымінавічамі і смаленскімі Рурыкавічамі былі заключаны два шлюбы. Як мяркуецца, з літоўскага боку выступалі сыны Кейстута Вітаўт і Таўцівіл, а са смаленскага – дочкі Святаслава Іванавіча. Аднак трэба адзначыць, што асобы жонак Вітаўта і Таўцівіла па сённяшні дзень застаюцца спрэчнымі. Частка навукоўцаў згаджаецца, што яны належалі да смаленскай лініі, частка ж прапаноўвае іншыя версіі.

Няма таксама аднаго ўстойлівага меркавання наконт жонак Вітаўта. Адны даследчыкі называюць трох жонак, іншыя – дзвюх. Мы разгледзім розныя меркаванні, каб вызначыць, ці была ўсё ж такі смаленская княжна жонкай Вітаўта Кейстутавіча.

Па-першае, трэба ўзгадаць Хроніку Быхаўца, якая прыводзіць наступную інфармацыю: «И князь великий Витовт, расширив государство свое от моря до моря, жил много лет и был три раза женат, первый раз на Анне, дочери князя Святослава Смоленского, второй раз на Марии, дочери князя Андрея Лукомского и Стародубского, а третий раз на Ульяне, дочери князя Ивана Ольгимонтовича Гольшанского, племяннице князя Семена Лютого и князя Андрея Вязанского, дочь этого князя Андрея, Софию, мать Владислава и Казимира, взял в жены король Ягайло» [8, с. 78].

Адной з самых распаўсюджаных версій шлюбаў Вітаўта з'яўляецца менавіта ўзгаданая вышэй, але з некаторымі зменамі: першай жонкай звычайна называецца Марыя Лукомская, а другой – Ганна Смаленская (хутчэй за ўсё храніст памяняў іх месцамі). Пра жыццё Марыі Лукомскай звестак амаль няма. Сучасныя гісторыкі лічаць памылкай называць яе жонкай Вітаўта, бо Хроніка Быхаўца не раз давала спрэчныя звесткі [13, с. 187].

Таксама трэба сказаць, што ў каментарыях выдання хронікі Віганда з Марбурга змяшчаецца апісанне асобы Вітаўта і там прыводзіцца наступная інфармацыя: «Первая жена – литовка из Жемайтии, вторая – Мария Лукомская, третья – Анна Смоленская» [9, с. 84].

Дадзеныя звесткі даволі спрэчныя. Даследчыкі ўвогуле не ўзгадвалі аб магчымай жонцы Вітаўта з Жамойці. Хутчэй за ўсё яеераблыталі з

яго маці Бірутай, якая была жрыцай і паходзіць з Жамойці. Асоба Марыі Лукомскай, як ужо адзначалася, з'яўляецца фактычна невядомай. Да таго ж, трэба звярнуць увагу і на тое, што ўвогуле не ўзгадваецца апошняя жонка Вітаўта Юліянія Гальшанская, нягледзячы на тое, што яе імя сустракаецца ў іншых крыніцах.

Таксама заўважым, што за некалькі дзён да сваёй смерці 21 кастрычніка 1430 г. Вітаўт пісаў віленскаму біскупу: «…жонак сваіх Ганны, што памерла, і Юліяніі жывой…» [10, с. 56]. Такім чынам, сам Вітаўт сведчыў аб тым, што ён меў двух жонак.

У выніку можна сцвярджаць, што першай жонкай Вітаўта была Ганна, дачка смаленскага князя Святаслава Іванавіча. Наконт даты заключэння шлюбу дакладных звестак няма. Вядома толькі тое, што пры жыцці яшчэ быў вялікі князь літоўскі Альгерд, які памёр у 1377 г. [11, с. 157]. Такім чынам, шлюб быў арганізаваны да 1377 г. Хаця часам называюць аж 60-я гг. XIV ст., калі Вітаўт быў яшчэ берасцейскім князем [7, с. 447].

Нягледзячы на дзейнасць бацькі, Ганна Святаславаўна да сваёй смерці заставалася вернай свайму мужу Вітаўту. Асабліва гэта можна заўважыць па аднаму з самых вядомых выпадкаў з яе жыцця: вызваленні Вітаўта з палону Ягайлы. Калі Кейстут быў задушаны ў Крэўскім замку, Вітаўт быў цяжка хворы. Ён даволі моцна ахоўваўся, але ўсё ж такі Ганне было дазволена яго наведваць. Увогуле, яна атрымала ад Ягайлы дазвол паехаць у Маравію, але толькі для сябе асабіста, без мужа. Тадыўначы перад сваім ад'ездам яна прыйшла наведаць свайго мужа. Пад час яе візіту Вітаўт пераапрануўся ў адзенне служанкі сваёй жонкі Алены. У выніку служанка засталася ў замку пад выглядам хворага Вітаўта, а ён сам разам з Ганнай змог збегчы. Толькі на трэці дзень Ягайла даведаўся пра падман і загадаў забіць Алену, а Вітаўт у гэты час быў ужо далёка. Ганна накіравалася за сваім мужам на землі Тэўтонскага Ордэна і падтрымлівала яго ва ўсіх памкненнях [12, с. 257].

Такім чынам, Вітаўт быў жанаты на смаленскай князёўне, яе бацька пэўны час дапамагаў Альгерду ў барацьбе з Масквой. Верагодна шлюб Вітаўта і Ганны мог быць заключаны яшчэ да 1368 г., да першага паходу на Маскву і яго ініцыятарам выступіў вялікі князь літоўскі Альгерд. У выніку гэты шлюб мог выступіць гарантыяй саюзных адносін Смаленска і ВКЛ. Аднак гэта не перашкодзіла Святаславу Іванавічу здрадзіць свайму саюзніку. Тым не менш, Смаленскае княствазаставалася ў значнай залежнасці ад Вялікага Княства Літоўскага, а пасля і было канчаткова да яго далучана.

Таўцівіл быў адным з малодшых сыноў Кейстута. Нарадзіўся ён прыкладна ў 1350 г., быў малодшы за Вітаўта [13, с. 227]. Згодна

Хронiцы Быхаўца,у Ганны, жонкі Вітаўта, была сястра Ульяна, якая ў свой час з'яўлялася жонкай Відзімунта, дзядзькі Біруты [8, с. 185]. Польскі гісторык Ю. Вольф выказаў здагадку, што пад такім жа імем была жонка ў Манівіда, але ён быў яе другім мужам [10, с. 67]. Першы ж памёр у 1390 г. Хутчэй за ўсё, першым мужам Ульяны быў Таўцівіл. Відзімунт жа ўвогуле не быў з ёй у шлюбе, а ў Хронiцы Быхаўца дапушчана чарговая памылка. Трэба сказаць, што дата заключэння шлюбу невядома.

Ульяна і Ганна былі дачкамі смаленскага князя Святаслава Іванавіча. Шлюбы Таўцівіла і Вітаўта самі па сабе вельмі падобны адзін да аднаго. Іх мэтай было імкненне распаўсюдзіць уплыў на Смаленскае княства і з цягам часу далучыць яго да Вялікага Княства Літоўскага. Не здарма з дзецьмі аднаго смаленскага князя заключаліся аж два дынастычныя шлюбы. Ініцыятарам з боку ВКЛ, хутчэй за ўсё, выступіў Альгерд, для якога правядзенне ўсходняй палітыкі было прыярытэтным. Ульяна Святаславаўна нарадзіла мужу дачку Ядвігу, якая атрымала сваё імя ў гонар польскай каралевы. У 1396 г. яна была выдадзена замуж за слупскага князя Барніма V [13, с. 223]. Мэтай гэтага шлюбу было больш цеснае збліжэнне са слупскімі князямі і неабходнасць у іх падтрымцы пад час барацьбы Польскага Каралеўства і Тэўтонскага Ордэна.

Такім чынам, праз ажыццяўленне шлюбаў з прадстаўнікамі мясцовай княжацкай дынастыі Гедымінавічы імкнуліся падпарадкаваць сабе тэрыторыі Смаленскага княства. Нягледзячы на тое, што ўжо з пачатку княжання Гедыміна на Смаленск распаўсюджваецца ўплыў ВКЛ, вельмі сур'ёзным апанентам у барацьбе за яго заставалася Масква, якая імкнулася, і часам паспяхова, перацягнуць смаленскіх князёў на свой бок. Праз шлюбы, Гедымінавічы імкнуліся замацаваць саюз са Смаленскам не проста пэўнымі дамовамі, а менавіта дынастычнымі сувязямі, каб парадніцца з мясцовымі князямі. Вялікаму Княству Літоўскаму ў выніку атрымалася паглынуць Смаленск, апярэдзіўшы ў гэтай справе Маскоўскае княства.

Пачаткам стварэння Вярхоўскіх княстваў лічыцца 1246 г., калі ў Ардзе быў забіты чарнігаўскі князь Міхаіл Усеваладавіч [14, с. 126]. Пасля яго смерці, княства фактычна было падзелена паміж яго сынамі, кожны з якіх імкнуўся пераўтварыць свой удзел у самастойную дзяржаўную адзінку. Гісторыкі лічаць, што канчатковае дзяленне Чарнігаўскага княства на больш малыя адбылося ў сярэдзіне XIV ст. [14, с. 128]. Галоўнай мэтай сваёй знешняй палітыкі князі Вярхоўскіх княстваў ставілі барацьбу супраць Арды і шукалі саюза з больш моцнымі суседзямі на антыардынскай аснове. Першапачаткова такога саюзніка Вярхоўскія княствы ўбачылі ў асобе маскоўскага князя і трапілі

пад яго ўплыў. Аднак у 1350-я, а асабліва ў 1360-я гг. у барацьбу за ўплыў на гэтых тэрыторыях уступіў вялікі князь літоўскі Альгерд. Падпарадкаваць сабе Вярхоўскія княствы Альгерд імкнуўся менавіта праз заключэнне дынастычных сувязяў з мясцовымі князямі. Так, было заключана два шлюбы з навасільскім і карачаўскім князямі.

Навасільскае княства трапіла пад уплыў Масквы ў 1340-я гг., але кропкай адыходу ад такога знешнепалітычнага арыенціра стала перамога Вялікага Княства Літоўскага ў бітве каля Сініх Вод у 1362 г. Замацаваць сваё становішча на гэтых землях Альгерд вырашыў заключэннем дынастычнага шлюбу, які адбыўся хутка пасля бітвы – князь Іван Навасільскі ажаніўся з невядомай дачкой Альгерда [13, с. 95].

Варта адзначыць, што дадзены шлюб быў падзеяй вельмі значнай. Навасільскі князь стаў саюзнікам вялікага князя літоўскага. У 1368 г. Альгерд здзейсніў свой першы паход на Маскву, пасля якога быў заключаны мір. Аднак Дзмітрый Іванавіч не жадаў трымаць міру і ўжо ў наступным годзе захапіў Ржэўскую валасць. У выніку гэтага зімовага наступу пацярпелі і іншыя тэрыторыі: «И зятя моего нижегородского князя Бориса схватили и княжество у него отняли; напали на зятя моего, новосильского князя Ивана и на его княжество, схватили его мать и отняли мою дочь не сложив клятвы, которую имели к ним» [14, с. 272]. З такімі словамі звяртаецца Альгерд да канстанцінопальскага патрыярха Філафея ў грамаце 1371 г. Тут утрымліваюцца дэталёвыя сведчанні пра абсяг уплыву ВКЛ на ўсходзе. Такім чынам, ніжагародскі і навасільскі князі, якія былі жанатыя з дачкамі Альгерда, былі саюзнымі, а, магчыма, нават залежнымі ад Вялікага Княства Літоўскага.

Распаўсюдзіў свой уплыў вялікі князь Альгерд і на Карачаўскае княства. У1350-я гг. Карачаў трапіў у залежнасць ад Вялікага Княства Маскоўскага. Аднак ужо каля 1360 г.карачаўскі князь Святаслаў Цітавіч перайшоў на бок Вялікага Княства Літоўскага, што было замацавана шлюбам Святаслава і дачкі Альгерда Феадоры [10, с. 27]. Фактычна, менавіта 1360 г. лічыцца тым момантам, калі Карачаўскае княства было ўключана ў склад ВКЛ. Мясцовыя князі станавіліся васаламі вялікага князя літоўскага і паступалі яму на службу.

Калі лёс Карачаўскага княства быў вырашаны, то навасільскія князі ў 1370-я гг. перайшлі на службу да маскоўскага князя. У першую чаргу гэта было звязана з пераарыентацыяй знешняй палітыкі ВКЛ на Залатую Арду, наладжваннем паміж імі добрых адносін. Як ужо ўзгадвалася вышэй, прыярытэтам знешняй палітыкі Вярхоўскіх княстваў была антыардынская накіраванасць, чаго не маглі змяніць нават дынастычныя сувязі з родам Гедымінавічаў. Праўда, супрацьстаянне з ВКЛ працягвалася не так доўга, і ўжо ў пачатку XV ст. Вярхоўскія княствы зноў трапілі пад

яго ўплыў, а некаторыя ўвогуле згубілі сваю незалежнасць і ўвайшлі ў склад Вялікага Княства Літоўскага.

Разгледзеўшы сувязі Літвы з Віцебскам, Смаленскам і Вярхоўскімі княствамі, можна сцвярджаць, што палітыка вялікіх князёў літоўскіх у гэтым напрамку была даволі паспяховай. Усе вышэй узгаданыя шлюбы мелі доўгатэрміновы разлік, які ў выніку прывёў да ўключэння новых тэрыторый у склад ВКЛ. У выпадку з Віцебскім княствам на гэта спатрэбілася толькі два гады, а вось з іншымі трэба было чакаць больш доўгі час. У кароткатэрміновай перспектыве дынастычныя сувязі са Смаленскім і Навасільскім княствамі не мелі поспеху, але праз некаторы час яны страцілі сваю незалежнасць і былі далучаны да ВКЛ. Перашкоды, якія паўставалі на шляху вывучаемай дынастычнай палітыкі вялікіх князёў літоўскіх, былі звязаны з барацьбой і супацьстаяннем з Маскоўскім княствам, якое ставіла тую ж мэту, што і Вільня: «збіранне рускіх зямель». У адносінах да Смаленскага і Вярхоўскіх княстваў канчатковую дыпламатычную перамогу ВКЛ змагло атрымаць толькі ў пачатку XV ст.

Пачатак палітыцы далучэння новых тэрыторый праз дынастычныя сувязі паклаў яшчэ вялікі князь літоўскі Гедымін, а працягнулі яго сыны Альгерд і Кейстут. Нягледзячы на тое, што прыярытэтам знешняй палітыкі Кейстута быў захад, ва ўсходніх знешнепалітычных акцыях ён таксама прымаў актыўны ўдзел, спрыяў заключэнню шлюбаў сваіх сыноў з прадстаўніцамі «рускіх» княстваў. Хоць супрацьстаянне ВКЛ і Масквы мела пераменны поспех на працягу стагоддзяў, на разгледжаных землях Вялікае Княства Літоўскае змагло замацаваць свой уплыў на доўгія гады.

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. *Любавский М. К.* Очерк истории Литовско-Русского государства до Люблинской унии включительно : с приложением текста хартий, выданных Великому княжеству Литовскому и его областям. М. : Московская художественная печатня, 1915.
2. *Тарас А. Е.* Войны Московской Руси с Великим княжеством Литовским и Речью Посполитой в XIV–XVII веках. М. : АСТ – Минск : Харвест, 2006.
3. *Краўцэвіч А. К.* Гедымін (1316–1341). Каралеўства Літвы і Русі = Hiedymin (1316–1341). Kingdom of Lithuania and Ruthenia. Мінск : С.Ю. Татарнікава, 2012.
4. *Голубовский П. В.* История Смоленской земли до начала XV века : монография. Киев, 1895.
5. *Писарев С. П.* Княжеская местность и храм князей в Смоленске : историко-археологическое исследование в связи с историей Смоленска. Смоленск : типо-лит. Ф. В. Зельдович, 1894.
6. *Антонович В. Б.* Монографіи по исторіи Западной и Юго-Западной Россіи. Кіевъ : Типографія Е. Я. Федорова, 1885. Т. 1.
7. Вялікае княства Літоўскае : энцыклапедыя : у 2 т. Мінск : Бел. энцыкл. імя П. Броўкі, 2005. – Т. 1.

8. *Тихомиров М. Н.* Хроника Быховца: памятники средневековой истории народов Центр. и Вост. Европы. М. : Наука, 1966.
9. *Виганд из Марбурга* Новая прусская хроника (1394). – М. : Русская панорама, 2014.
10. *Wolff J.* Ród Gedimina. Dodatki i poprawki do dzieł K. Stadnickiego: «Synowie Gedymina", «Olgierd i Kiejstut» i «Bracia Władysława Jagiełły». Kraków, 1886.
11. Вялікае княства Літоўскае : энцыклапедыя : у 2 т. Мінск : Бел. энцыкл. імя П. Броўкі, 2010. – Т. 3.
12. Беларускія летапісы і хронікі. Мінск : Міжнар. фонд «Бел. кнігазбор», 1997.
13. *Tęgowski J.* Pierwsze pokolenia Giedyminowiczów. Poznań – Wrocław, 1999. T. 2.
14. *Краўцэвіч А. К.* Гісторыя Вялікага Княства Літоўскага, 1248–1377 гг. Гародня [Гродна] : Аляксандр Краўцэвіч – Уроцлаў [Вроцлаў] : Kolegium Europy Wschodniejim Jana Nowaka-Jeziorańskiego, 2015.

# ПОЛИТИЧЕСКИЙ ПРОЦЕСС МИЛАДЫ ГОРАКОВОЙ (1950 г.) КАК ФЕНОМЕН СОВРЕМЕННОЙ ЧЕШСКОЙ ИСТОРИЧЕСКОЙ ПАМЯТИ

**М. А. Лавринович**

*Белорусский государственный университет, г. Минск;*
*lavrinovichmarina1996@mail.ru;*
*науч. рук. – В. В. Репин, канд. ист. наук, доц.*

Представленная работа посвящена исследованию феномена политических репрессий, ставших значимым явлением общественно-политической жизни Чехословакии в период режима К. Готвальда в конце 1940-х – начале 1950-х гг. Основываясь на новейших документальных публикациях российских и чешских архивов, а также на широком спектре исследовательской литературы на русском и чешском языках, в работе анализируется сфабрикованный политический процесс по обвинению в «Заговоре против республики» 1950 г., главной фигуранткой которого стала женщина-политик, представитель Партии народных социалистов Милада Горакова; определяется место, занимаемое фигурой Милады Гораковой и жертвами репрессий периода коммунизма в современной чешской исторической памяти.

***Ключевые слова***: репрессивная политика; политический процесс; Милада Горакова; историческая память.

После кратковременного переходного этапа «Народной демократии» (1944–1948), в Чехословакии наступил период внедрения принципов организации общества по советскому образцу. Февральские события 1948 г., что позволили Коммунистической партии Чехословакии (КПЧ) стать единовластным гегемоном и поэтому сконцентрировать всю полноту политической власти в своих руках, стали отравной точкой в последовавшей коммунизации региона.

Репрессивная политика КПЧ, затронувшая как политическую оппозицию коммунистического режима, так и внутрипартийные номенклатур-